- развитие личностного музыкально-эстетического восприятия художественных произведений и способности их воспроизведения на основе полученных знаний в учебных заведениях;

- формирование художественного вкуса, эстетических интересов, потребностей слушателей посредством исполнения художественно-значимого репертуара, активное участие в концертно-исполнительской практике ансамблей и оркестров, а также в качестве солистов - исполнителей на духовых и ударных музыкальных инструментах.

[1] Лихачев Б.Т. Общие вопросы воспитания школьников. - М., 1997. - С. 123.

[2] Каралькоў М.А. Развіццё эстэтычнай культуры студэнтаў (праблемы, тэндэнцыі) //Развіццё творчых здольнасцей студэнтаў: праблемы, пошукі, рашэнні: Дакл. навук.-метад. канф. (1-2 лютага 1996 г.). - Мн.: Бел. ун-т культуры, 1997. - С. 21.

[3] Арчажникова Л.Г. Профессия - учитель музыки: Кн. для учителя. - М., 1984. - С. 9.

[4] Волков В.В. Вопросы теории и практики исполнительства на трубе: Уч. пособие. - Мн., 1999.

[5] Карацееў А.Л. Ансамблі духавых інструментаў у гісторыі музычнай культуры Беларусі // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва: Тэз. дакл. навук.- творчай канф. (19-20 красавіка 1994 г.). - Мн., 1994. - С. 45-46; Карацееў А.Л. Выкарыстанне мастацка-выразнага патэнцыялу ансамбляў у падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых інструментах // Праблемы ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі: Тэз. дакл. навук. – метад. канф. (2-3 лютага 1995 г.). - Мн., 1995. - С. 37-38.

[6] Карацееў А.Л. Фарміраванне творчай актыўнасці як абавязковая ўмова якаснай падрыхтоўкі выканаўцаў у сферы духавога мастацтва (традыцыі і перспектывы) // Развіццё творчых здольнасцей студэнтаў: праблемы, пошукі, рашэнні. Дакл. навук.-метад. канф. (1-2 лютага 1996 г.). - Мн., 1997. - С. 23-26.

## ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА Ў КАНТЭКСЦЕ ДУХОЎНАГА І МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**Р.Ф. Шаура**

### НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ЯК СРОДАК ДУХОЎНАГА РАЗВІЦЦЯ ЧАЛАВЕКА

Народная выяўленчая творчасць Беларусі, якая атрымала найбольш паспяховае і спрыяльнае развіццё на сучасным этапе, прайшла доўгі і складаны шлях нараджэння, станаўлення і сапраўднага росквіту. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця краіны адкрылі шырокім працоўным масам надзейны шлях да духоўнага абагачэння. Народныя майстры, мастакі-аматары набылі магчымасць свабоднага і featureнабаковага выяўлення талентаў і творчых здольнасцей.

Перад народнай творчасцю ў першыя паслярэвалюцыйныя гады сталі канкрэтныя задачы стварэння новага, пралетарскага мастацтва,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якое павінна было рашаць надзённыя працоўныя задачы эстэтычнага і ідэйна-маральнага выхавання працоўных мас. Характэрнай асаблівасцю ў развіцці творчай самадзейнасці ў гэты перыяд была агітацыйна-прапагандысцкая накіраванасць, якая выяўлялася ў мастацка-афарміцельскіх, аб`ёмна-пластычных і прыкладных формах мастацтва. Афармленне палітычных свят, аздабленне вуліц і плошчаў гарадоў, выпуск маляваных і тыражыраваных плакатаў, стварэнне першых помнікаў вядомым рэвалюцыйным дзеячам, дзеячам навукі, культуры праходзілі пры непасрэдным удзеле самадзейных мастакоў і народных майстроў.

Тэматыка твораў у гэты перыяд адлюстроўвала самыя актуальныя праблемы і задачы, якія стаялі перад маладой савецкай рэспублікай. Барацьба за перамогу сацыяльных пераўтварэнняў станавілася галоўным зместам жывапісных палотнаў, графікі, скульптуры. У іх востра і злабадзённа раскрываліся тэмы індустрыялізацыі, калектывізацыі, асветы, развіцця абароннай магутнасці нашай краіны.

Народная творчасць у перадваенныя гады адзначана актыўнасцю і шматграннасцю далучэння шырокіх слаёў працоўных мас да культуры. Задача культурнай асветы на чале з агульнаадукацыйным навучаннем з`яўлялася жыццёва актуальнай. Ствараліся мастацкія школы, студыі, гурткі, спецыяльныя курсы, якія аб`ядноўвалі народныя таленты.

У гэты перыяд развіццю самадзейнай творчасці істотную дапамогу аказвала прафесійнае мастацтва. Многія мастацкія выстаўкі арганізоўваліся сумесна, што адлюстроўвала непасрэдную і цесную сувязь апошняга з народнай творчасцю.

Асобай з`явай у культуры Беларусі стала самадзейная творчасць у гады Вялікай Айчыннай вайны. Партызанская графіка як найбольш магчымы і аператыўны від мастацтва адыгрывала выключна важную ролю ў маральнай і патрыятычнай падтрымцы духу савецкіх людзей, якія змагаліся за незалежнасць нашай Радзімы. Сотні рукапісных часопісаў, насценных газет, лістовак змяшчаюць унікальны гістарычны матэрыял — тэматычныя кампазіцыі, партрэты, пейзажы, сатырычныя замалёўкі, выкананыя партызанскімі самадзейнымі мастакамі. Іх мастацтва адкрывае жывую, дакументальную старонку мужнасці, стойкасці і масавага гераізму савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Народная творчасць прадэманстравала выключную жыццёвую сілу, яна мела велізарнае мабілізуючае і натхняючае значэнне ў агульнанароднай вызваленчай барацьбе.

У 50-я — да другой паловы 60-х гадоў у самадзейнай творчасці праглядваецца пераемнасць традыцый, характэрных перадваеннаму перыяду. Дамы народнай творчасці, а потым і Дамы мастацкай самадзейнасці ў арганізацыйна-метадычнай рабоце трымаліся пэўных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стэрэатыпаў. У рабоце самадзейных мастакоў у асноўным заахвочвалася пераймание прафесійнага мастацтва і не прымаўся, а часам адкідваўся так званы “прымітыў”, які лічыўся творчай бездапаможнасцю значнай масы людзей, якія спрабавалі сказаць сваё слова ў творчасці не рамеснымі навыкамі, а “душой і сэрцам”.

Далёка не заўсёды прадстаўнічыя выстаўкі самадзейнай творчасці ў гэты перыяд маглі вызваць цікавасць у масавага гледача. Аднастайнасць выканаўчых прыёмаў і манер пазбаўляла самабытнай арыгінальнасці большасць твораў.

Усё вастрэй ставілася праблема навучання самадзейных мастакоў. Студыі, ізагурткі, творчыя семінары за многія гады атрымалі добры вопыт, выпрацавалі пэўныя традыцыі вучэбнага працэсу, але разам з тым нараджалі шэраг недахопаў, якія адмоўна адбіваліся на далейшым развіцці выяўленчай самадзейнасці.

З пачатку 70-х гадоў метадычныя арганізацыі і навуковыя ўстановы значную ўвагу ўдзяляюць творчым асаблівасцям самадзейных мастакоў. У экспазіцыю выставак сталі шырока прадстаўляцца творы, выкананыя ў самабытнай, “наіўнай” манеры. Гэта ажывіла агульную карціну выяўленчай самадзейнасці, павысіла цікавасць да яе з боку масавага гледача. Прыкметна выдзеліліся разнастайныя творчыя індывідуальнасці, расшырыліся граніцы тэм, у першыя рады стала тэматычная карціна, якая ў мінулым арганізатарамі выставак у значнай ступені недаацэньвалася. Адыход у самадзейнай творчасці ад прафесійнай арыентацыі, якая дамінавала дагэтуль, даў магчымасць кожнаму мастаку свабодна і самастойна ісці сваім творчым шляхам. У выставачных экспазіцыях сталі аб`ядноўвацца розныя плыні мастацка-вобразных прыёмаў і рашэнняў, што падкрэслівае адно з каштоўных якасцей непрафесійнага мастацтва — яго стылявую шматграннасць.

Самадзейныя мастакі паспяхова засвойваюць усе жанры. Тэматычная карціна ўсё больш і глыбей адлюстроўвае вытворчы працэс, сельскагаспадарчую працу, розныя бакі жыцця працоўных. У апошні час значна ўзраслі выяўленчыя магчымасці творцаў, якія здольны раскрываць факты, эпізоды, падзеі вобразна-абагульненымі мастацкімі сродкамі.

На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў у самадзейнай творчасці Беларусі адной з распаўсюджаных тэм з`яўлялася тэма Вялікай Айчыннай вайны. Да яе звярталіся не толькі ўдзельнікі мінулых баёў, але і маладыя мастакі, якія па-свойму разумелі і асэнсоўвалі гераічную гісторыю нашага народа.

У апошні час значнае развіццё атрымалі партрэтны і пейзажны жанры. Калі раней партрэт развіваўся як вучэбная работа, то на сучасным этапе галоўнае месца займае творчы партрэт. Акрамя таго, самадзейныя мастакі не абмяжоўваюцца пошукамі стварэння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сінтэзаваных, глыбока псіхалагічных чалавечых вобразаў. Большасць работ прысвячаецца людзям працы з іх штодзённымі турботамі і праблемамі.

Дзесяткі мастацкіх выставак наглядна раскрылі вялікія дасягненні ў жанры пейзажа. Ад пейзажа камернага і, часцей, лірычнага мастакі прыкметна ўздымаюцца да пейзажа эпічнага, манументальнага гучання. Краса роднага краю раскрываецца ў яркіх, насычаных і непаўторных фарбах і формах.

Самадзейная выяўленчая творчасць мае выключна важнае выхаваўчае значэнне. Яна з`яўляецца актыўнай крыніцай зносін з прыгожым значнай масы людзей, якія бескарысліва, толькі па клічу свайго сэрца, становяцца на нялёгкі шлях мастака, часам ідуць праз шматлікія цяжкасці, каб задаволіць унутраную патрэбу творчай дзейнасці. Кожны чалавек, займаючыся творчасцю, удасканальвае свой духоўны свет, маральныя і эстэтычныя якасці. Акрамя таго, ён самым непасрэдным чынам аказвае ўплыў на навакольнае асяроддзе, робіць яго больш змястоўным і эстэтычна багатым.

“Сацыяльная эфектыўнасць мастацтва, — як вельмі правільна піша Ю.У.Фохт-Бабушкін, — гэта яго ўдзел ва ўсебаковым духоўным развіцці асобы, якая з`яўляецца найвышэйшай мэтай нашага грамадства. Менавіта духоўнае развіццё чалавека, г.зн. станаўленне яго стваральнага, пазнаваўчага, цэннасна-арыентацыйнага, камунікацыйнага, мастацкага патэнцыялу, вядзе да абагачэння дзейнасці асобы, больш паспяховага выканання яго сацыяльных роляў, а значыць, да ўдасканальвання вытворчасці, эканомікі, сацыяльных адносін, усяго вобраза жыцця”[1].

Творчасць народа — самадзейнае выяўленчае мастацтва, прадстаўляючы сабой структурны элемент мастацкай культуры, выконвае важную функцыю не толькі выхаваўчай культурна-асветніцкай работы, але і актыўна спрыяе сябс ў стварэнні сапраўдных твораў мастацтва. Гэта наглядна дэманструюць лепшыя творы жывапісу, графікі і скульптуры самадзейных мастакоў Беларусі.

Сучасны ўзровень развіцця выяўленчай самадзейнасці, якая характарызуецца не толькі масавасцю далучэння да творчага працэсу, але і шырокімі мастацкімі магчымасцямі і дасягненнямі, сапраўды абвяргае ўяўныя меркаванні аб “другараднасці” яе ў адносінах да “вучонага” мастацтва. Народная творчасць заваёўвае ўсё большае прызнанне ў агульнанароднай духоўнай культуры. Як адно са звёнаў адзінага рэалістычнага мастацтва яна рашае важную задачу ўсебаковага развіцця чалавека з пазіцыі высокіх сучасных патрабаванняў.

[1] Фохт-Бабушкин Ю.У. Искусство и духовный мир человека. - М., 1982. - С. 43.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ